# ПЕЧ ВА ЎЯЎЛЕННЯХ І АБРАДАХ БЕЛАРУСАЎ У XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

**В.Я. Сільвестрава**

У народна-міфалагічным асэнсаванні беларусаў у XIX – пачатку XX ст. хата з'яўлялася своеасаблівай мадэллю свету і асэнсоўвалася як бяспечнае і рытуальна чыстае месца. З гэтай прычыны важнае значэнне надавалася пэўным месцам хаты. У народных уяўленнях беларусаў, як і іншых славянскіх народаў, печ з пячным вуглом і покуць (чырвоны кут) лічыліся найбольш значнымі і святымі часткамі хаты.

Мэта дадзенага даследавання - прааналізаваць успрыманне і разуменне хаты беларусамі ў XIX – пачатку XX ст. на прыкладзе ўяўленняў пра печ. Асноўную базу крыніц для вывучэння склалі працы этнографаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

М.Я.Нікіфароўскага, А.К.Сержпутоўскага, М.Федароўскага, П.В.Шэйна і інш.[2]

Печ адыгрывала значную ролю ў абрадах беларусаў. Так, у радзільным абрадзе печ выступала як засцерагальнік новага члена сям'і ад уздзеяння нячыстай сілы. У час сватання печ успрымалася як жывая істота і лічылася, што сваты пэўнымі магічнымі дзеяннямі маглі атрымаць благаслаўленне ад печы на ўдалае сватаўство. Печ атаясамлялася з жаночым пачаткам.

Ва усведамленні беларусаў у вывучаемы перыяд печ - месца знаходжання душ продкаў. Таму, напрыклад, печ магла прадказваць смерць. Печ успрымалася і як надзейная абарона ад шкоднага уздзеяння хваробы або смерці. Засцерагальная функцыя печы праяўлялася ў ахове членаў сям'і ад іншых людзей. Таму лічылася непажаданым пакідаць печ адкрытай, каб не адкрываліся чужыя рты абгаварыць каго-небудзь з сям'і. Вялікая моц печы, па ўяўленнях беларусаў, прадвызначыла яе выкарыстанне у народнай магіі і медыцыне.

Вялікая пашана да печы зафіксавана ў прыказках-забаронах беларусаў на ужыванне ў хаце грубых, непрыстойных слоў: "Няможна казаць, бо печ у хаце".

Такім чынам, у народных уяўленнях беларусаў у XIX – пачатку XX ст. печ лічылася галоўным засцерагальнікам, сімвалам сям'і, роду, а таксама сімвалам жаночага, нараджаючага пачатку, месцам знаходжання душ продкаў. Печ усведамлялася як жывая істота, член сям'і, мела ахоўную, лячэбную і ачышчальную функцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ